# Свята, прысвечанае Кітайскаму новаму году

26 лютага 2019 года ў дзяржаўнай установе "Гімназія № 23 г.Мінска" адбылося ўрачыстае і традыцыйнае свята, прысвечанае Кітайскаму новаму году (па ўсходнім каляндары).

У свяце прынялі ўдзел: першы сакратар па справах адукацыі Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь спадарыня Лі Вэнхуа; намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ спадарыня Сун Яньвэй; дырэктар, педагог і вучні гімназіі № 23 г.Мінска, запрошаныя госці, якія маюць дачыненне да развіцця сістэмы вывучэння і выкладання кітайскай мовы ў Рэспубліцы Беларусь.

Перад пачаткам канцэрта вучні I-XI класаў з вывучэннем кітайскай мовы разам з валанцёрамі з РІКК БДУ, ІК МДЛУ і ІК БНТУ прынялі ўдзел у майстар-класах па каліграфіі, папяровых карунках і чайнай цырымоніі.

Канцэрт пачаўся з віншавальных слоў дырэктара гімназіі Пасюкевіч Ірыны Леанідаўны і першага сакратара па справах адукацыі Пасольства Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь спадарыні Лі Вэнхуа. Намеснік дырэктара Рэспубліканскага інстытута кітаязнаўства імя Канфуцыя БДУ спадарыня Сун Яньвэй павіншавала таксама ўсіх са святам Вясны і ўручыла падзяку нашай установе адукацыі за актыўны ўдзел ва ўрачыстым канцэрце, прысвечаным Святу ліхтароў. У ходзе нашага мерапрыемства адбылося ўзнагароджанне вучняў нашай гімназіі, якія дасягнулі найлепшых вынікаў у конкурсах і алімпіядах па кітайскай мове. Кітайскіх гасцей павіншавалі вакальная студыя “Сцежачка”, дзіцячая студыя фальклорнага калектыву “Гуда”, фолк-група “Росквіт”, клуб кунг-фу для дзяцей “Wudeschool”.

Заканчэннем канцэрта стала сумеснае фота ўрачыстага і традыцыйнага свята.

